*Інтэрнат — твой дом*

# КАЛІ ПАДЫХОД ТВОРЧЫ...

Значнае месца ў сістэме ідэйна-выхаваўчай работы, якая вядзецца ў нашым універсітэце са студэнцкай моладдзю, займае выхаваўчая работа ў студэнцкіх інтэрнатах. Яе значэнне асабліва ўзрасло з уводам новага інтэрната ў Валатаве. Практычна ўсе іншагароднія студэнты сталі жыць у інтэрнаце.

У гэтым годзе будучыя матэматыкі жывуць у адным інтэрнаце — па вуліцы Кірава. Гэта дало магчымасць сканцэнтраваць выхаваўчую работу кафедр, дэканата, грамадскіх арганізацый у адным месцы, што, на наш погляд, павысіла яе эфектыўнасць.

Усё пачалося з агульнага сходу жыхароў. Перад студэнтамі выступілі дэкан факультэта У. Ф. Філіпцоў, сакратар партыйнага бюро матфака Л. Я. Палякоў, старшыня студэнцкага прафкома Н. І. Колтышава, камендант інтэрната Л. І. Рашкевіч. Быў выбраны студэнцкі савет, які ўзначаліла чацвёртакурсніца Вера Эрліх.

Члены студсавета распрацавалі план ідэйна-выхаваўчай работы. На яго аснове дэканат і партбюро факультэта склалі комплексны план выхаваўчай работы ў інтэрнаце, у які ўвайшлі, акрамя мерапрыемстваў, запланаваных студсаветам, планы кафедр, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый. Ён быў разгледжан і зацверджан на партыйным сходзе матфака. Вызначаны розныя напрамкі дзейнасці — арганізацыйныя мерапрыемствы, разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва, маральна-эстэтычнае выхаванне, культурна-масавая, спартыўная, прафарыентацыйная работа, прапаганда прававых ведаў і г. д.

Для падбору канкрэтных спраў было праведзена апытанне студэнтаў. Яны выказвалі свае прапановы, як зрабіць цікавым жыццё у інтэрнае, якія мерапрыемствы правесці.

Комплексны план з'яўляецца перспектыўным. Пры неабходнасці ў яго ўносяцца неабходныя карэктывы.

Ажыццявіць на практыцы намечанае было б складана без пастаяннага кантакту, які падтрымлівае студсавет, куратар інтэрната з дэканатам, партыйнай і камсамольскай арганізацыямі факультэта. Шмат увагі ўдзяляе інтэрнату намеснік дэкана матфака М. В. Селькін. Ён рэгулярна бывае там, дапамагае студсавету ў вырашэнні ўзнікаючых пытанняў. Пастаянна кантралюе работу студсавета, куратара, кафедр партыйная арганізацыя факультэта. У перыяд з лістапада мінулага года па сакавік бягучага, пытанні, якія датычаць розных аспектаў выхаваўчай работы ў інтэрнаце, двойчы заслухоўваліся на партыйным бюро і два разы — на агульным партыйным сходзе факультэта. Вось канкрэтны прыклад, які характарызуе адносіны партыйнай арганізацыі да праблем інтэрната.

Да моманту засялення студэнтаў матфака ў інтэрнат № 2. там нагляднай агітацыі практычна не было. Таму студсавет прыняў адпаведнае рашэнне аб яе афармленні, распрацаваў тэматыку. Аднак ажыццявіць задуманае аказалася не проста. Таму гэта пытанне было разгледжана на партыйным сходзе факультэта. На ім прынялі рашэнне арганізаваць спецыяльную групу з прадстаўнікоў дэканата, партбюро, камсамольскай арганізацыі для аказання студсавету неабходнай дапамогі. І справа зрушылася з «мёртвай кропкі». Работнікі бібліятэкі ГДУ дапамаглі ў набыцці і падборы ілюстрацыйнага матэрыялу, адміністрацыйна-гаспадарчая частка выдзеліла фанеру і інш. У інтэрнаце ўжо афармлена каля дваццаці новых стэндаў, абноўлены некаторыя з існаваўшых, прычым, наглядная агітацыя кожнага паверха не паўтараецца, мае сваю тэматыку.

Важнае месца ў выхаваўчай рабоце, якая праводзіцца ў інтэрнаце, займаюць мерапрыемствы кафедр факультэта. Кожная з іх мае свой асабісты план работы, які прадугледжвае гутаркі, дыспуты, вечары пытанняў і адказаў, шахматныя турніры і г. д. Для таго, каб планы кафедр не паўтараліся, перад канчатковым зацвярджэннем яны каардынуюцца дэканатам.

Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца ў студэнтаў матфака стаўшыя традыцыйнымі дні кафедр у інтэрнаце. На працягу гэтых дзён выкладчыкі кафедры праводзяць вечар-сустрэчу са студэнтамі, масавыя мерапрыемствы, арганізоўваюць дзяжурства і кансультацыі для студэнтаў па дысцыплінах, якія яны выкладаюць.

Асобна хацелася б сказаць аб дзяжурстве выкладчыкаў у інтэрнаце. У гэтым годзе яно стала абавязковым. На нашу думку, дзяжурствы патрэбны. Пры правільнай арганізацыі яны могуць прынесці значны выхаваўчы эфект. Заўважана, што ў той вечар, калі дзяжурыць выкладчык, у інтэрнаце не здараецца ніякіх «ЧП». Ужо адна яго прысутнасць там дысцыплінуе студэнтаў, прадухіляе парушэнні распарадку і правіл пражывання ў інтэрнаце. Акрамя таго, за тры-чатыры гадзіны, якія выкладчык знаходзіцца тут, можна правесці індывідуальную гутарку, арганізаваць тое ці іншае мерапрыемства, даць кансультацыю ў чытальнай зале, праверыць санітарны стан пакояў і г. д. Паказальнымі ў гэтым плане можна лічыць дзяжурствы членаў кафедры тэорыі верагоднасцей і матэматычнай статыстыкі. Дацэнт Л. М. Федарэнка, напрыклад, у час свайго знаходжання ў інтэрнаце дала падрабязныя кансультацыі многім студэнтам. Асістэнт С. М. Вінічэнка арганізаваў турнір па настольнаму тэнісу, асістэнт Я. А. Кавалёў — шахматную сустрэчу са студэнтамі. Яны ж правялі некалькі гутарак са студэнтамі. Загадчык кафедры Ю. У. Малінкоўскі часта наведвае інтэрнат, удзельнічае ў арганізацыі і правядзенні ў ім карысных мерапрыемстваў.

На сакавіцкім пасяджэнні Савета па рабоце ў інтэрнатах пры парткоме універсітэта ўзнікла пытанне: ці не вялікая нагрузка на членаў кафедр — акрамя ўдзелу ў мерапрыемствах кафедры яшчэ і дзяжурыць у пэўныя дні? У нас на факультэце кожнаму супрацоўніку на працягу семестра даводзіцца дзяжурыць у сярэднім два разы. Цяжкасцю гэта не з'яўляецца, карысць жа ад такіх арганізаваных дзяжурстваў відавочная.

Вялікую ролю ў выхаваўчай рабоце адыгрывае сацыялістычнае спаборніцтва на лепшы пакой інтэрната, якое праходзіць пад дэвізам: «Інтэрнат — твой дом. Зрабі яго ўзорным!» У палажэнне аб спаборніцтве ўключаны такія пункты, як удзел пакоя ў падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў у інтэрнаце, яго санітарны стан, дзяжурства па паверху і на вахце, захаванне правілаў пражывання ў інтэрнаце і г. д. З мэтай надання сацыялістычнаму спаборніцтву галоснасці на кожным паверсе вывешваюцца экраны санітарнага стану, у фае інтэрната ўстаноўлен стэнд «Перадавікі сацыялістычнага спаборніцтва». Ход спаборніцтва асвятляецца ў насценных газетах факультэта «Веды — сіла!», інтэрната.

Ёсць у нас і свае праблемы. Не заўсёды на ўзроўні праходзіць дзяжурства студэнтаў на паверхах, асабліва на пятым, хаця студсавет робіць усе захады для паляпшэння становішча. Шмат яшчэ прадстаіць зрабіць для афармлення нагляднай агітацыі ў Ленінскім пакоі.

Бадай, адной з самых вострых праблем з'яўляецца рамонт інтэрната, які цягнецца ўжо не першы месяц і стварае нямала складанасцей для навядзення ў ім належнага парадку. Гэтыя цяжкасці, зразумела, носяць часовы характар, мы іх пераадолеем.

Творчы падыход да справы — выхаваўчай работы ў інтэрнаце — дае станоўчыя вынікі.

**С. БАДРУНОЎ,**
**старшы куратар інтэрната № 2 матэматычнага факультэта.**

**АД РЭДАКЦЫІ. Як абстаяць справы ў астатніх інтэрнатах універсітэта? Вырашэнне якіх праблем, пытанняў хвалюе іх жыхароў? Запрашаем падзяліцца сваімі думкамі, прапановамі куратараў, старшынь студсаветаў, студэнтаў на старонках нашай газеты.**



**ВЯСЕННІ РАЗЛІЎ.**

**Фота С. Коваля, студэнта 2-га курса геафака.**

*Вуліца — аўтамабіль — пешаход*

# УЗМАЦНЯЦЬ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЬ

**У сакавіку бягучага года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прыняў указ «Аб адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў дарожнага руху». Ён будзе садзейнічаць умацаванню дысцыпліны на транспарце, барацьбе з парушэннямі правілаў дарожнага руху, лепшаму забеспячэнню бяспекі перавозак людзей і грузаў, ахове правоў і законных інтарэсаў грамадзян.**

**Усё яшчэ нізкі ўзровень дысцыпліны сярод вадзіцеляў і пешаходаў, вялікая колькасць дарожных здарэнняў, у тым ліку з раненнямі і смерцю людзей выклікалі ўдасканальванне заканадаўства аб транспарце.**

**З наступленнем вясновалетняга перыяду на дарогах і вуліцах горада з кожным днём павялічваецца колькасць транспартных сродкаў усіх відаў. У сувязі з гэтым пешаходам трэба быць асабліва ўважлівымі, каб не стварыць аварыйнай абстаноўкі.**

**За першы квартал бягучага года ў г. Гомелі звыш дзевяці тысяч чалавек зрабілі розныя парушэнні правілаў дарожнага руху. За гэты перыяд 5200 пешаходаў аштрафаваны. Па віне пешаходаў у горадзе адбылося 13 дарожна-транспартных здарэнняў, пры якіх адзін чалавек загінуў і 12 — паранена.**

**Частымі парушальнікамі правілаў дарожнага руху з'яўляюцца, на жаль, і студэнты універсітэта. Аб гэтым сведчаць паведамленні з міліцыі горада аб штрафах. Толькі за сакавік-красавік аштрафана звыш 20 студэнтаў. Гэта В. Паеўскі, А. Крыско, І. Барташэвіч, П. Базараў, В. Літвінаў, В. Музыкін, В. Яшын, С. Пузыня, Т. Альшанік, Н. Галавачова, Ж. Жураўкова, Н. Працко і інш.**

**А. РАМАНОВІЧ,**
**пазаштатны прапагандыст правілаў дарожнага руху пры ГДУ.**



Студэнты фізічнага факультэта Ю. Гуменнікаў і С. Сцепанькоў захапляюцца водным турызмам. Гэты здымак быў зроблены ў час іх воднага падарожжа па Карэліі.

*Спорт*

# БЛІЗКА ФІНІШ

У ГДУ працягваюцца спаборніцтвы па праграме круглагадовай універсіяды, якая набліжаецца да свайго фінішу.

У турнірах па баскетболу, як паведаміў рэдакцыі галоўны суддзя спаборніцтваў П. П. Саковіч, сярод мужчынскіх каманд мацнейшымі аказаліся студэнты факультэта фізвыхавання. Другі радок у турнірнай табліцы заняла каманда эканамічнага факультэта, трэці — матфака. Сярод жаночых каманд чэмпіёнкамі сталі будучыя эканамісткі, другімі прызёрамі — студэнткі факультэта фізвыхавання, трэцімі — гістфіла.

Цікавасць выклікалі паядынкі на дыване барцоў-класікаў. У камандным заліку на першае месца выйшлі асілкі геалагічнага факультэта. Асабліва вызначыўся майстар спорту СССР Аляксандр Сакалоў (вагавая катэгорыя да 68 кг). Усе сустрэчы ён закончыў датэрмінова з чыстым выйгрышам. Чэмпіёнам стаў і яго таварыш па спорту і вучобе кандыдат у майстры спорту Васіль Бычкоўскі (57 кг).

На другое месца ў камандным заліку выйшлі барцы фізічнага факультэта, на трэцяе — эканамічнага.

Па меркаванню галоўнага суддзі спаборніцтваў С. М. Дзегцярова, сярод барцоў, акрамя названых спартсменаў, вызначыліся таксама першакурснік факультэта фізвыхавання майстар спорту Г. Казараў і сакратар камітэта камсамола эканамічнага факультэта кандыдат у майстры спорту В. Жосткін (100 кг).

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 56-16-52.
АЗ 20297
Заказ 1621